3 Лепешаў, І. Я. Праблема фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 264 с.
4 Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. Т. 3: Л – П / рэд. тома П. М. Гапановіч. – Мінск : Гал. рэд. Бел. Сав. Энцыклапедыі, 1979. – 672 с.
5 Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. Т. 1: А – В / рэд. тома М. П. Лобан. – Мінск : Гал. рэд. Бел. Сав. Энцыклапедыі, 1977. – 608 с.

**УДК 821.161.3-31*І.Сін:124.43**

***А. В. Цімашэнка***

## АКСІЯЛАГІЧНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ І ЭСТЭТЫЧНЫ ІДЭАЛ У ПРОЗЕ ІЛЛІ СІНА

*У артыкуле разглядаюцца аксіялагічныя прыярытэты, пошук і спосабы ўвасаблення эстэтычнага ідэалу І. Сінам. Вызначаюцца прыёмы, з дапамогай якіх пісьменнік рэалізуе і ўзмацняе ўздзеянне трансгрэсіўнай прозы на рэцыпіента: апісанне табуіраваных і шакуючых сцэн, культываванне антыэстэтыкі пачварнага, выкарыстанне іроніі і гратэску ў адносінах да сур'ёзных і забароненых тэм. Аўтар прыходзіць да высновы, што, акцэнтуючы ўвагу на пачварным, пісьменнік дабіваецца адваротнага эфекту: прыцягнуць увагу да маральна-этычных праблем сучаснага грамадства.*

Аксіялагічны падыход у літаратуры патрабуе звароту да каштоўнасных арыенціраў аўтарскай свядомасці. Літаратурны твор анталагічны па сваёй сутнасці, бо з'яўляецца спробай пісьменніка ўзняць адвечныя пытанні, што хвалююць чалавецтва на працягу ўсяго існавання. Аксіялогія як філасофскі напрамак займаецца "даследаваннем каштоўнасцяў як сэнсаўтваральных асноў чалавечага быцця, якія задаюць накіраванасць і матываванасць чалавечаму жыццю, дзейнасці і канкрэтным дзеянням і ўчынкам" [1]. Пошук пісьменнікам эстэтычнага ідэалу і магчымасці адлюстраваць сваё разуменне прыгожага з'яўляецца адным з крытэрыяў, якія вызначаюць творчую індывідуальнасць аўтара.

Трансгрэсіўная проза І. Сіна заснавана на парушэннях табу і прыёмах выхаду за межы дазволенага з мэтай выклікаць у рэцыпіента эстэтычны шок і такім чынам звярнуць увагу чытача на актуальныя праблемы сучаснасці. "А эстэтычная мяжа, – заўважае А. Бязлепкіна, – для яго палягае на ўзроўні сексуальнай паталогіі, якая ў тэксце прысутнічае толькі тэрміналагічна" [2, с. 125]. Даследчыца прыводзіць у якасці прыкладу наступны эпізод з "Карнавала на вуліцы Гідраўлічнай" (зборнік "0"): "На вуліцах раздавалі цукраныя пернікі з выяваю прабабулі імператара, а ў кожным задворку можна было бачыць ужо звыклыя для жыхароў места сцэны педафіліі" [3, с. 28]. Ці, напрыклад, у творы "Machine of dreams" са зборніка "Белетрыстыка" герою падчас экскурсіі будаўнічай камісіі па забаўляльным цэнтры перад уваходам у патрэбнае памяшканне трапляецца своеасаблівая інструкцыя, якая складаецца з наступных пунктаў: "4. Пасля другога павароту вы ўсё самі ўбачыце. Галоўнае, адкіньце сорам і ўнутраныя перашкоды. Рэкамендуем не спыняцца падоўгу ля звязаных дзяўчатаў з выдзертымі смочкамі (© Bondageforhell Design Studio). Рушце далей, там будзе куды цікавей. <...> 7. У выпадку інцэсту, звярніцеся, калі ласка, у рэгістрацыйны пункт № 4. 8. Людзям са схільнасцю да празмернага гвалту неабходна потым прыбраць і прадэзынфектаваць памяшканне" [5, с. 11]. Пры гэтым А. Бязлепкіна дадае, што "трансгрэсіўны накірунак творчасці вымушае І. Сіна пераадольваць найперш уласную каталіцкасць" [2, с. 125]. Доказам гэтага меркавання служыць рэлігійны аспект інтэнцыянальнасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пісьменніка, які спараджае наяўнасць такіх архетыповых вобразаў, як грэх (“Карнавал на вуліцы Гідраўлічнай”, зборнік “0”), зрынуты анёл, выгнанне бесаў, апакаліпсіс (“Тэатральныя дэманы”), Страшны Суд (“0”), уваскрэсенне, пакаранне прарока (“Карнавал на вуліцы Гідраўлічнай”), Апошняя вячэра (перфоманс “Supper”) і інш.

Трэба сказаць, што пошук эстэтычнага ідэалу ў І. Сіна рэалізуецца праз эфект адваротнага ўздзеяння і раскрываецца, перш за ўсё, праз культываванне антыэстэтыкі пачварнага цела і гіпербалізаванай увагі да фізіялогіі і чалавечых органаў. Так, Васіль – адзін з санітараў у рамане “Тэатральныя дэманы”, – раскрыжоўваючы труп загінуўшага анёла-дэмана, заўважае: “Вантробы нібыта ў парадку. Кішкі нават эластычнасць пакуль не страцілі. Свежанькі значыць” [4, с. 10]. Ці, напрыклад, герой ужо ўзгаданага раней апавядання “Machine of dreams” падчас экскурсіі, зазірнуўшы ў адно з памяшканняў, назірае такую карціну: “Сярод лішніх частак пераважалі хвасты, хаця траплял́іся таксама і ўнутраныя воргáны: пакрытыя дробнай сеткай капіляраў, змякчэлыя, з жоўтымі пісягамі, месцамі прадзіраўленыя” [5, с. 11]. Акцэнтуючы ўвагу на пачварным, аўтар ідзе ад адваротнага: такія зневажальныя адносіны да тэмы смерці і чалавечай абалонкі павінны выклікаць у чытача ўнутраныя супярэчнасці і на падсвядомым узроўні абудзіць адносіны да жыцця як да найвялікшай каштоўнасці.

Выкарыстанне прыёму іроніі ў адносінах да сур’ёзных, і нават забароненых, тэм выклікае эфект камічнага. Напрыклад, апавяданне “0” пачынаецца з гумарыстычнага пераліку прыкмет “таго, што ты ўжо памёр” [3, с. 48], дзе сярод іншага адзначаецца наступнае: “3. Дуб дубам. Праз 5–6 гадзінаў пасля смерці хімічныя рэакцыі ў арганізме прыводзяць да адраўлення ўсіх мускулаў. Цябе можна падняць і знесці як бервяно. <...> 6. Амаль анічога не цікавіць. Калі ты памёр, табе будзе пофіг, чым заняцца ўвечары” [3, с. 48]. Такая эстэтычная правакацыя – своеасаблівая барацьба з чалавечымі страхамі. Гэтага ж меркавання прытрымліваецца і А. Бязлепкіна: “<...> страшнае ў літаратурным творы можа функцыянаваць як гульня, як спаборніцтва, як правакацыя. <...> Ілля Сін у празаічных тэкстах займаецца эпатажам і блюзнерствам, намацвае межы дазволенага, выпрабоўваючы межы эстэтычных пачуццяў патэнцыяльных чытачоў (а таксама свае) на здольнасць успрымаць агіднасць і чалавечыя страхі” [2, с. 124].

Тэма самагубцаў і самагубства ў пісьменніка таксама падаецца ў саркастычна-іранічнай стылістыцы. У адной з частак “Сапсаваных лялек” – “New baBilon forever” (першы раздзел – “Мярзота і запусценне”) – апісваецца новая мода, уведзеная ў месце Нью-Бабілон, якая культывуе суіцыд і нажываецца на самагубствах простых гараджан. У горадзе пачалі прадавацца прыстасаванні для паспяховых здзяйсненняў суіцыду, а трупы людзей сталі ўпрыгожваць рэкламнымі постэрамі: “Толькі каляровых матузкоў для шыбенікаў я налічыў у адной лаўцы нешта каля трох тысячаў. І якіх там толькі не было! Бірузовыя, блакітна-зялёныя, ружовыя, урэшце, колеру хакі – спецыяльна для прыхільнікаў экстрэмальнай музыкі. У суседняй вітрыне выстаўленыя перадсмяротныя запіскі. Як мне сказалі, апошнія пару год стала модна не пісаць іх самім, а карыстацца ўжо гатовымі – можна пайсці ў краму і абраць тую, якая табе найболей да густу. <...> Колькі год таму да целаў шыбенікаў, якімі спрэс усеяная цэнтральная вуліца места, сталі чапляць рэкламныя плакаты, а на святы іх нязменна ўпрыгожваюць зіхоткімі каляровымі гірляндамі” [6, с. 98]. Як можна заўважыць, у дадзеным эпізодзе высмейваецца філасофія грамадства спажывання і вынікаў таго, што яно спараджае.

У мастацкім свеце твораў І. Сіна роль і ўздзеянне масавай культуры на грамадства падаецца ў гіпербалізавана негатыўным святле. У “Сапсаваных ляльках” танная, няякасная субкультура, што забівае чалавечую індывідуальнасць, з’яўляецца часткай інтэр’еру, своеасаблівай дэкарацыяй, якая ненавязліва запаўняе сабой адзінокую прастору існавання персанажаў: “У маленькім тэлевізары «Гарызонт», што стаяў на лядоўні, нейкая цыцкастая эстрадная дзеўка спевамі прызнавалася ў каханні зусім безуважнаму да ўсяго рызэншнаўцэру. Ц зрабіў гук трохі цішэй і паглядзеў у вакно” [6, с. 10].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Увогуле, у прасторы постмадэрну тэлебачанне з’яўляецца адным з самых плённых вобразаў для стварэння гульні з рэчаіснасцю, чым вельмі часта карыстаюцца сучасныя пісьменнікі. Маскульт становіцца неад’емнай часткай жыцця персанажаў, укараняецца ў іх падсвядомасці, робячыся складовай мысленчага працэсу: “Вечар. Па тэлевізары ідзе баявік, за вокнамі дождж. Мая плоць спявае для мяне як Майкл Джэксан” [6, с. 81]. Аўтарамі часопіса “Новая Еўропа” ў рэцэнзіі на другі зборнік Іллі Сіна “Сапсаваныя лялькі” заўважаецца адмоўнае стаўленне пісьменніка да масавай культуры, што “выліваецца ў яркую гратэскавую алегорыю: жанчына, якая імкнецца патлумачыць герою сутнасць акцёрскай прафесіі, агаляе свае ненатуральна вялікія грудзі ды пачынае па чарзе карміць сотню нейкіх пачварак, якія жылі ў насценных стэляжах” [7]. У якасці прыкладу прыводзіцца сцэна з апісаннем гэтага працэсу: “Яны ад радасці падскоквалі на сваіх курыных лапках ды лізалі цыцкі языкамі, што высоўваліся з абсалютна чалавечых галоваў” [6, с. 85].

Ужо ўзгаданага раней героя апавядання “Machine of dreams” са зборніка “Белетрыстыка” падчас назірання жудаснага сховішча лішніх частак цела таемных істотаў наведвае толькі адна думка: “з’явілася тэма для паста ў ЖЖ” [5, с. 11]. Праблема віртуальнага эксгібіцыянізму як асноўная рыса псіхікі сучаснага чалавека неаднаразова паўставала перад журналістамі і сацыёлагамі. Т. Грызенкова тлумачыць гэтую з’яву атаясамліваннем асобай свайго ўласнага “я” з профілем у сацыяльных сетках: “Жыць для профілю – значыць стаць праекцыяй грамадства, ператварыцца ў рэха масы зарэгістраваных карыстальнікаў, прымаючы яго за сваю індывідуальнасць” [8]. Даследчыца лічыць, што пануючае становішча сацыяльных сетак з’яўляецца разбуральным для асобы чалавека. І. Сін у сваёй творчасці засяроджвае ўвагу на пытаннях захавання асобай сваёй унутранай індывідуальнасці. Аўтарскую канцэпцыю можна сфармуляваць у наступным, можна сказаць, рытарычным, пытанні: ці з’яўляецца маскульт своеасаблівай формай страты чалавекам асобаснай культуры у эпоху кліпавага мыслення, калі сапраўднае мастацтва падмяняецца шырспажывам?

Такім чынам, трансгрэсіўная проза Іллі Сіна заснавана на парушэннях табу і імкненні да выхаду за межы дазволенага з мэтай выклікаць у рэцыпіента эстэтычны шок і такім чынам звярнуць яго ўвагу на актуальныя маральна-этычныя праблемы сучаснага соцыуму і скажэнне яго аксіялагічнай сістэмы. У сваіх творах пісьменнік закранае тэму смерці, праблемы самагубства, пашырэння масавай і знікнення індывідуальнай культуры. Акцэнтуючы ўвагу на пачварным і агідным, І. Сін ідзе ад адваротнага: такія зневажальныя адносіны да элементаў быцця, што заўсёды былі сакральнымі ў чалавечай свядомасці: да смерці, цела, міжполавых зносінаў – павінны прымусіць чытача задумацца аб правільнасці сваіх каштоўнасных арыенціраў. Аксіялагічныя прыярытэты творцы накіраваны на сцвярджэнне ідэі каштоўнасці чалавечага жыцця, захаванні індывідуальнага ў кожнай асобе і ўменні прымаць сябе такім, які ты ёсць.

**Літаратура**

1 Новейший философский словарь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://dic.academic.ru/dic.nsf/dic_new_philosophy/55/Аксиология. – Дата доступа: 17.04.17.

2 Бязлепкіна, А. П. Трансгрэсія ў сучаснай беларускай літаратуры і нацыяльная традыцыя / А. П. Бязлепкіна // Русская и белорусская литературы на рубеже XX–XXI вв.: сб. науч. статей: в 2 ч. Ч. 1 / редкол.: С. Я. Гончарова-Грабовская (отв. ред) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2007. – С. 123–126.

3 Сін, І. Нуль / І. Сін. – СПб: ООО “Невский простор”, 2002. – 108 с.

4 Сін, І. Тэатральныя дэманы: тэксты / Ілля Сін. – Мінск : Галіяфы, 2010. – 176 с.

5 Сін, І. Белетрыстыка / І. Сін; у аўтарскай рэдакцыі. – Мінск, 2014. – 77 с.

6 Сін, І. Сапсаваныя лялькі / І. Сін. – Мінск, 2006. – 109с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7 25-ы кадр Ільлі Сіна [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://n-europe.eu/content/p/1294. – Дата доступу: 03.05.17.

8 Гризенкова, Т. Статус на странице: аперитив для дальнейшего знакомства [Электронный ресурс] / Т. Гризенкова // Ртуть: интернет-журнал. – 2017. – 1 мая. – Режим доступа: https://vk.com/hgydrargyrum?w= wall-29718152_37312. – Дата доступа: 04.05.17.

**УДК 94:339.5 (470+430) «14/15»**

***Д. П. Цуранова***

## ИЗМЕНЕНИЯ В РУССКО-ГАНЗЕЙСКОЙ ТОРГОВЛЕ ПОСЛЕ ПРИСОЕДИНЕНИЯ НОВГОРОДА К ВЕЛИКОМУ КНЯЖЕСТВУ МОСКОВСКОМУ (1470-Е ГОДЫ – КОНЕЦ XV ВЕКА)

*В статье автор рассматривает развитие новгородско-ганзейских отношений после вхождения первого в новую политическую структуру. Уделяется внимание рассмотрению следующих вопросов: изменению экономической политики Новгорода по отношению к Ганзе после вхождения новгородских земель в состав Великого княжества Московского, причины закрытия Ганзейского двора в Новгороде в 1494 году, политика Ивана III по отношению к местному купечеству.*

Создание единого Русского государства являлось сложным процессом и имело огромное значение для развития экономических сил Новгорода. Весь XV век над этими землями нависала угроса присоединения к Москве. Немаловажным оставался вопрос о том, как повлияют политические изменения на ход торгово сотрудничества Новгорода с Ганзейским союзом.

Присоединение Новгорода к Москве в январе 1478 года на первых порах ничего не поменяло в ведении торговли между немецкими и новгородскими купцами. Иван III подписал специальную грамоту, которая была выдана между 29 января и 17 февраля того же года, подтвердив ею прежнее положение ганзейцев на право свободной торговли с Новгородом [1]. Также он утвердил гарантии беспрепятственного пути и честного суда в случае конфликтных ситуаций между сторонами. Такое великодушие могло свидетельствовать о желании Ивана III не менять статуса немецких купцов, так как резкие изменения во внешнеэкономической политике Новгорода могли послужить к поднятию оппозиционных настроений среди населения новоприсоединённой территории [2].

Несмотря на подтверждение прежнего положения ганзейцев в начале 1478 года, немецкие купцы были арестованы в Новгороде. Как было отмечено ранее, князь Московский не желал препятствовать торговле и арест ганзейцев был лишь свидетельством очередного конфликта. Однако у представителей ливонских городов на этот счёт было своё мнение. Так 10 марта 1478 года они писали в г. Любек о том, что немецкие купцы были задержаны на русских землях по причине подчинения Новгорода Москве.

В 1478 году Иван III гарантировал Ганзе сохранность традиционных норм ведения торговли, а уже в 1487 году немцам были предъявлены требования, которые подрывали давно устоявшиеся нормы. Решительные перемены были вызваны как внешнеполитическими, так и внутренними успехами Москвы. В 1480 году была поставлена точка в деле о господстве татарского ига, а 1481 год ознаменовался подписанием мирного договора с Ливонией. Также большую роль играло подчинение Великого княжества Тверского московскому князю [3], [4].

Соглашение 1487 года является первым договором, заключённым между Новгородом и Ганзой после того, как первый вошёл в состав Московского государства. По существу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ